## Просіцца сэрца ў палёт

*Лычкоўскі Максім,* студэнт групы 11201418, СФ
Кіраўнік канд. гіст. навук, дацэнт *Дз.М. Хромчанка*

Айчына, Радзіма, Бацькаўшчына! Яна заўсёды ў нашых сэрцах і свядомасці, у вечнай і нязменнай любві да роднага краю, да роднага кута, да бацькоўскай хаты. Яна пачыналася з адвечнай бярозы пад тым акном, праз якое мы ўпершыню ўбачылі свет, з бацькоўскага дома, дзе мы ўсвядомілі паняцці малой і вялікай Радзімы, асэнсоўваем яе далёкае і нядаўняе мінулае, яе ўчарашні, сёняшні і заўтрашні дні.

У неўміручай памяці маёй малой Радзімы – Талачыншчыны і набегі чужаземцаў, і крывавыя міжусобіцы, ад якіх гарэлі хаты, гінулі дзеці. Непакорная, гордая і непахісная Талачыншчына, як і ўся Беларусь-партызанка, у адзіным парыве грудзьмі засланіла сваю зямлю ад чужынцаў у час Вялікай Айчыннай вайны. Тысячы яе мужных сыноў і дачок зрабілі свой край непрыступным, партызанскім.

Адным з такіх герояў, якімі ганарыцца Талачыншчына, з'яўляецца мой зямляк Герой Савецкага Саюза Аляксей Андрэевіч Лузгін. Нарадзіўся ён 1 лютага 1920 г. ў вёсцы Загараддзе. Аляксей – дзясяты з сям'і Лузгіных.

Пасля смерці бацькі ў 1931 годзе Аляксей пераехаў да брата Сцяпана ў Маскву. Там ён у 1936 годзе скончыў восем класаў школы. У 1936–1937 гадах працаваў падсобным рабочым на Маскоўскім электромоторной заводзе, у 1937–1939 гадах – у першым Маскоўскім пасажырскім аддзяленні Кастрычніцкай чыгункі. Потым – лётнае вучылішча. Цяпер ужо ніякая сіла не магла спыніць яго імкненне. “Толькі лятаць! І лятаць так, як Чкалаў!”

Выпускнік лётнага вучылішча Аляксей Лузгін яшчэ не паспеў атрымаць накіраванне ў вайсковую часць, як радыё прынесла страшную вестку: вайна. Малады лётчык не мог дачакацца таго дня, калі яму дадуць самалёт, каб паляцець туды, дзе не на жыццё, а на смерць змагаюцца з ворагам савецкія воіны. І раптам як снег на галаву: “Таварыш Лузгін, па загаду начальніка вучылішча вы

застаецеся тут. Будзеце працаваць інструктарам.” З такім назначэннем цяжка было змірыцца.

Прайшоў месяц, другі, трэці… І ўвесь гэты час Аляксей думаў аб адным і тым жа: трэба вырвацца на фронт. І хоць ён разумеў важнасць сваёй службы, ведаў, што краіне патрэбны лётчыкі, якіх рыхтавала іх вучылішча, але сэрцам не мог змірыцца з тым, што яго сябры, яго аднагодкі глядзяць смерці ў твар, ідуць на таран, накіроўваюць свае палаючыя машыны на скопішчы ворага, а ён, “тылавы пацук”, зрабіўся інструктарам. Аляксей Лузгін піша спачатку адзін рапарт, потым – другі. Просьба ўсё тая ж: ”Пашліце на фронт”. І толькі праз год ён трапіў у полк далёкіх разведчыкаў рэзерва Галоўнага камандавання. Камандзір звяна 4-га асобнага разведвальнага авіяцыйнага палка Лузгін удзельнічаў у Курскай бітве, вызваленні Украіны, у Корсунь-Шаўчэнкаўскай, Львоўска-Сандамірскай, Вісла-Одэрскай, Берлінскай і Пражскай аперацыях.

7 сакавіка 1944 года яго самалёт быў збіты каля сяла Шастакова (Украіна). Апынуўшыся на варожай тэрыторыі, пераапрануўся ў грамадзянскую вопратку і тройчы спрабаваў перайсці лінію фронту, але безпаспяхова. У выніку апынуўся ў сяле Ўрадзіеўка, якое 28 сакавіка 1944 г. было вызвалена нашымі войскамі. Прайшоўшы спецправерку, у канцы чэрвеня 1944 г. вярнуўся ў свой полк. І зноў – баявыя заданні, палёты над варожай тэрыторыяй, радасці і горач франтавога жыцця.

За гады вайны Лузгін зрабіў 116 баявых вылетаў, правёў 32 паветраныя баі. Ад камандзіра звяна ён вырас да намесніка камандзіра палка па лётнай падрыхтоўцы. За мужнасць і гераізм, за подзвігі, праяўленыя ў баях, 15 мая 1946 года старшаму лейтэнанту Лузгіну Аляксею Андрэевічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Пасля вайны А.А.Лузгін лятаў на рэактыўных самалётах, вучыў лётнаму майстэрству курсантаў. У 1960 годзе ў званні палкоўніка выйшаў у адстаўку. Часта прыязджаў на Талачыншчыну, наведваў сваю родную вёску Загараддзе.

У лютым-ліпені 1963 года Лузгін працаваў дырэктарам станцыі дарожнага абслугоўвання, у 1965–1968 гадах – тэхнікам у навукова-даследчым інстытуце аўтаматыкі. Жыў у Маскве. Памёр 10 студзеня 1977 года. Пахаваны на Кунцаўскіх могілках у Маскве.

Яго імем названа вуліца ў горадзе Талачыне, а таксама самалёт СУ-24 МР.